Задача художника-юмориста – развлекать читателей, исправляя их недостатки. Но кроме развлекательной функции, юмористические рисунки выполняют функцию конституирования социальных ценностей.

Анализ юмористических рисунков П. Козича помогает понять, что имеет значение для белорусского общества и культуры, что считается юмором в белорусской культуре. Культурные коды, лежащие в основе юмористических рисунков П. Козича, можно использовать для получения сведений об этосе – характере, преобладающей черте, духе и мировоззрении современного белоруса. П. Козич использует юмор как важный концептуальный и методологический инструмент, который позволяет понять поведенческие паттерны белорусского общества.

### Библиографические ссылки


1. «Спасибо за связь с миром». Письма читателей «Витьбичей», пришедшие в редакцию накануне 30-летия газеты [Электронный ресурс]. URL: https://www.vitbichi.by/news/30_letie_vitbichey/post47796.html (дата обращения:17.05.2021).
2. *Ликок С.* Юмор, как я его понимаю. Юмористические рассказы. М. : Эксмо-пресс, 2001. 512 с.
3. *Борев Ю.* Комическое. М. : Искусство, 1970. 272 с.
4. *Лао Шэ.* Избранные произведения. М. : Художественная литература, 1991. 704 с.


## СЕМАНТЫЧНАЯ СУМЕЖНАСЦЬ У СУЧАСНЫХ ТЭКСТАХ РЭГІЯНАЛЬНАГА ДРУКУ


***В. А. Горбач***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*Gorbach_olga@mail.ru*



У матэрыяле даследуюцца найбольш тыповыя прыклады функцыянавання метаніміі ў тэкстах рэгіянальных газет Беларусі. Разглядаюцца асаблівасці ўключэння ў медыятэкст семантычнай сумежнасці.



***Ключавыя словы:*** метанімія; семантычная сумежнасць; тыпы пераносу; рэгіянальны друк.

# SEMANTIC COHERENCE IN MODERN TEXTS OF THE REGIONAL PRESS

***O. A. Horbach***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: O. A. Horbach (Gorbach_olga@mail.ru)*

The article examines the most typical examples of the use of metonymy in the texts of regional newspapers in Belarus. The features of including semantic coherence in the media text are considered.

***Key words:*** metonymy; semantic coherence; transfer types; regional press.

Экспрэсіўнасць медыямаўлення традыцыйна адлюстравана ў выбары вобразных сродкаў мовы, сярод якіх тыповымі з’яўляюцца канструкцыі, заснаваныя на семантычнай сумежнасці (метаніміі). Уключэнне метаніміі ў тэксты рэгіянальных СМІ рэалізуе некалькі функцый: 1) функцыя захавання закона моўнай эканоміі; 2) функцыя канкрэтызацыі актуальных тэм паведамленняў, цікавых для масавай аўдыторыі рэгёнаў; 3) функцыя перадачы «аўтарскага я» ў тэксце пасродкам лексічных пераносаў па сумежнасці.

Выбар тэмы тэкстаў транфармуецца ў тэматычнай уніфікацыі метаніміі праз актуальнасць, сацыяльную зададзенасць паведамленняў, праблематыку, што вынікае з фактаў дзейнасці і цікавасці грамадства таго ці іншага рэгёна. Найбольш частотнымі відамі семантычнай сумежнасці з’яўляюцца наступныя віды: *установа – супрацоўнікі, месца – насельніцтва, час – падзея*, якія развіваюць тэму паведамленняў з пазіцыі праблематыкі і даступнасці фактаў для рэгіянальнай аўдыторыі чытачоў.

Так, асацыятыўная сувязь метаніміі паміж лексемамі, якія раскрываюць ці канкрэтытуюць дзейнасць грамадства ў розных сферах, перадаецца мадэлямі тыпу: «Гродненский *горисполком* разработал проект детального плана исторического центра города» (Вечерний Гродно, 5 мая 2021), «Беражліва захоўвае памяць гісторыка-краязнаўчы *музей* Крывошынскай СШ імя Г. С. Здановіча» (Ляхавіцкі веснік, 30 чэрв. 2021), «*МЧС* рассказал о последствиях ветра 3 мая» (Шлях перамогі, 4 мая 2021), «Борисовский *БАТЭ* в шаге от выхода в финал

Кубка Беларуси-2020/21» (Адзінства, 4 мая 2021), «*Всемирная организация здравоохранения* заявила о своем намерении дать полную оценку безопасности антиковидной вакцины производства Российской Федерации «Спутник V» (Вечерний Брест, 4 мая 2021). У адзначаных мадэлях рэалізаваны від метанімічнага пераносу: *установа – супрацоўнікі*, які адлюстроўвае першыя дзве адзначаныя вышэй функцыі тропу. Лексемы «Гродненский *горисполком*», «*музей* Крывошынскай СШ імя Г. С. Здановіча», «*МЧС*», «Борисовский *БАТЭ*», «Всемирная *организация* здравоохранения» праз скасаванне дэтальнага апісання дзеянняў той ці іншай арганізацыі ці ўстановы канкрэтытуюць інфармацыю ў друку, чым прыводзяць да ўласных назваў, вядомых масавай аўдыторыі, ствараюць больш аператыўны і дынамічны медыятэкст.

Рэгіянальная прызначанасць тэкстаў вылучаецца ў транфармацыі метанімічных канструкцый: *месца – насельніцтва, месца – падзеі.* Напрыклад, «*Раён* сее лён. Ляхавіччына з’яўляецца адной з нямногіх – па пальцах рукі можна пералічыць – тэрыторый Брэсцкай вобласці, дзе шчыльна займаюцца льном» (Ляхавіцкі веснік, 10 красав. 2021), «В МЧС рассказали, как пострадала *Гродненская область* от вчерашней непогоды» (Вечерний Гродно, 4 мая 2021). У падобных канструкцыях выразна рэалізуецца скіраванасць газетных матэрыялаў да падачы фактаў з дзейнасці насельніцтва ў дакладным месцы, што павышае цікавасць чытачоў да таго, што звязана з прыватным месцажыхарствам, з тымі фактамі рэчаіснасці, якія адбываюцца на канкрэтнай тэрыторыі.

Цікавымі метанімічнымі мадэлямі, якія характарызуюць медыямаўленне рэгіянальных выданняў, варта адзначыць прыклады, у якіх назіраецца перанос: *час – падзея.* Тыповымі з’яўляюцца канструкцыі тыпу: «*Февральские музыкальные вечера»* начнутся сегодня в Пинске. Фестиваль, ставший культурным брендом города над Пиной, проходит уже в 27-й раз» (Вечерний Брест, 11 лют. 2021), Музыка безрецептурного отпуска. *«Январские вечера»* увидим… в июле» (Вечерний Брест, 18 снежн. 2020). Часавая суаднесенасць з падзеямі ці мерапрыемствамі, рэалізаваная праз уключэнне семантычнай сумежнасці ў медыятэксты, даказвае цікавасць да тэмпаральнай інфармацыі ў СМІ, якая можа быць сродкам «геакультурнага брэйдзінга тэрыторый», у якой метанімія побач з метафарай з’яўляюцца складнікамі «кагнітыўнай схемы

развіцця гуманітарна-геаграфічных вобразаў тэрыторыі» [1, с. 10] і выпрацоўваюць агульны імідж таго ці іншага месца.

Такім чынам, адзначым, што семантычная сумежнасць у рэгіянальным друку застаецца тыповым вобразным сродкам, які павышае экспрэсіўнае напаўненне тэкстаў, пры гэтым з'яўляецца элементам канкрэтызацыі матэрыялаў, накіраваных на раскрыццё прасторава-тэмпаральнай суаднесенасці зместу з фактамі рэчаіснасці праз асацыятыўны выбар уласных лексем, часта пададзеных у трансфармацыі відаў метанімічнага пераносу: установа – супрацоўнікі, месца – насельніцтва, час – падзея (мерапрыемства). На нашу думку, гэты від тропаў можа садзейнічаць папулярызацыі матэрыялаў, звязаных з дзейнасцю рэгіёнаў і пададзеных  ў рэспубліканскіх СМІ, якія будуць пашыраць цікавасць масавай аўдыторыі да падзей у рэгіёнах Беларусі праз іх кагнітыўны медыябрэйдынг.

### Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Замятин Д. Н.* Геокультурный брейдинг территорий: концептуальные основы [Электронны рэсурс]. URL: https://cyberleninka.ru/article/n/geokulturnyy-brending-territoriy-kontseptualnye-osnovy (дата обращения: 06.05.2021).


## ПЕРИОДИЗАЦИЯ РЕГИОНАЛЬНОЙ ВЕБ-ЖУРНАЛИСТИКИ В КОНТЕКСТЕ РАЗВИТИЯ ЦИФРОВЫХ ТЕХНОЛОГИЙ


***А. А. Градюшко***

*Белорусский государственный университет,*
*ул. Кальварийская, 9, 220004, г. Минск, Республика Беларусь,*
*webjourn@gmail.com*



Предлагается периодизация региональной веб-журналистики Беларуси с выделением ключевых этапов ее становления. Делается попытка на основе методологии системного подхода и принципов историзма обобщить 25-летний опыт внедрения цифровых технологий в практику работы локальных медиа.



***Ключевые слова:*** история белорусской журналистики; цифровые технологии; онлайн-журналистика; периодизация; системный подход.